**С. Л. Казлова**

# НІДЭРЛАНДСКАЯ ЎСХОДНЯЯ КАМПАНІЯ: ГАЛАНДСКІЯ ФЕРМЕРЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

У 1942 г. правал маланкавай вайны з СССР аказаў уплыў на ваенную эканоміку нацысцкай Германіі. Недахопы ў ваенна-стратэгічнай сыравіне, сельскагаспадарчай прадукцыі і працоўнай сіле паставілі краіну ў цяжкую сітуацыю. Створаныя яшчэ да вайны рэзервы прадукцыі, нягледзячы на рабаванне акупаваных краін у 1941–1942 гг., былі ў значнай ступені вычарпаны. Вясной 1942 г. запасы збожжавых культур і тлушчаў зменшыліся да мінімуму. У нацысцкай Германіі пачалося скарачэнне выдачы сельскагаспадарчай прадукцыі па картачках. У красавіку нормы выдачы хлеба зменшыліся на 10 %, тлушчаў – амаль на 25 %, мяса – на 25 % [1, с. 50].

Кіраўніцтва Трэцяга рэйха ў пошуках выйсця з крызіснага становішча вырашыла максімальна выкарыстоўваць ўсе ваенныя і ваенна-эканамічныя рэсурсы. Была праведзена рэарганізацыя ваеннай эканомікі. Галоўная прычына гэтай з’явы хавалася ва ўсё большым недахопе ўласных сіл і вытворчага патэнцыялу [2, с. 163, 187]. Была тут таксама і арыентацыя на будучую каланізацыю захопленай усходняй тэрыторыі. Гэта тычылася перш за ўсё «адзінства» германскіх народаў – Германіі, Нідэрландаў, Даніі, Швецыі, Нарвегіі – у эканамічным выкарыстанні захопленых савецкіх тэрыторый.

У канцы лістапада 1941 г. рэйхсмаршалам Трэцяга рэйха Г. Герынгам была праведзена нарада з прадстаўнікамі ўсходняга міністэрства, міністэрства эканомікі, міністэрства прадукцыі, на якой было вырашана, што практычнае супрацоўніцтва германскіх народаў павінна ажыццяўляцца не толькі на фронце праз замежныя легіёны, але і таксама праз рашэнне эканамічных задач на Усходзе. Гэта, на думку нямецкіх спецыялістаў, заключалася перш за ўсё ў тым, што «патрабаванні ў людзях для гаспадарчага засваення захопленых савецкіх тэрыторый адной нацысцкай Германіяй на той момант не маглі быць забяспечаны»[1]. Адзначалася, што замежнае супрацоўніцтва магло ажыццяўляцца пры даволі жорсткай умове: гаспадарча-палітычным кіраўніцтвам на акупаванай савецкай тэрыторыі павінна была займацца ў любым выпадку толькі нацысцкая Германія. Асабліва падкрэслівалася, што забеспячэнне еўрапейскага замежжа прадукцыяй з захопленых усходніх тэрыторый за кошт рэйха нават не разглядаецца. Хутчэй трэба было зыходзіць з таго, што «Германія захапіла савецкія вобласці з дапамогай іншых еўрапейскіх краін і апошнія маюць права патрабаваць сабе долю іх гаспадаркі«. На нарадзе было вырашана, што дырэктывы і ўказанні па супрацоўніцтве з замежнымі краінамі ў гаспадарчым выкарыстанні захопленых усходніх тэрыторый павінны будуць давацца Г. Герынгам і А. Розенбергам разам з удзелам іншых міністраў [3, л. 6, 9].

Такім чынам, кіраўніцтвам нацысцкай Германіі робяцца захады па падрыхтоўцы замежнай працоўнай сілы, выкарыстоўваючы для гэтай мэты калабарацыянісцкі рух. Былі выпрацаваны планы па каланізацыі акупаваных

[1] Пераклад тут і далей зроблены аўтарам артыкула.

усходніх тэрыторый «узорнымі замежнымі фермерамі германскай крыві». Найбольш рэальна планы па эканамічнай каланізацыі захопленай савецкай тэрыторыі ўдалося ажыццявіць толькі з Нідэрландамі. Ва «усходнім міністэрстве» нарадзілася ідэя, згодна з якой было вырашана перасяліць каля 3 млн галандцаў – практычна трэць усяго насельніцтва краіны – у рэйхскамісарыяты «Остланд» і «Украіна» [4].

Першыя захады па накіраванні галандскіх грамадзян на каланізацыю ўсходніх тэрыторый былі зроблены ўжо ў лістападзе 1941 г. Яны былі накіраваны галандскай гандлёва-сельскагаспадарчай арганізацыяй «Кулано» (дакладна перакладаецца як камісія па перасяленні фермераў ва ўсходнюю Еўропу), якая заключыла дамовы з 600 галандскімі фермерамі. Пры гэтым былі заключаны дамовы на іх супрацоўніцтва з землясробчым таварыствам «Остланд». Спачатку іх накіроўвалі на два тыдні вывучаць сельскагаспадарчыя дысцыпліны ў польскі горад Лодзь (Litzmannstadt), пасля адсылалі ў Рыгу. Першаахвотнікі павінны былі працаваць на тэрыторыі генеральных акруг «Літва» і «Беларусь» да сакавіка 1942 г. уключна. Аднак умовы жыцця гэтых першых галандскіх фермераў аказаліся складанымі, многія з іх не былі падрыхтаваны да такой працы, што і прымусіла некаторых з іх хутка вярнуцца на радзіму [5].

Тады было вырашана, што трэба стварыць разгалінаваную арганізацыю, якая магла б забяспечыць добрую адукацыю, надзейную працу, страхаванне і высокую зарплату для будучых каланістаў. 19 лютага 1942 г. адбыліся перамовы паміж намеснікам усходняга міністра Альфрэдам Мейерам і кіраўніком нацыянал-сацыялістычнага руху (НСР) у Галандыі Антонам Адрыанам Мусертам, на якіх разглядаліся пытанні аб размяшчэнні галандцаў на захопленых савецкіх тэрыторыях. Мусерт адзначыў, што «пасля страты галандскім народам калоній існуе неабходнасць хутчэй заняцца акупаванымі ўсходнімі тэрыторыямі, каб там знайсці новыя працоўныя і вытворчыя магчымасці». Ён сцвярджаў, што ў Галандыі, пры яе невялікай плошчы, існуе лішак сялянскага насельніцтва, і пытанне размяшчэння галандскіх сялян у якасці кіраўнікоў дзяржаўных гаспадарак на захопленых усходніх тэрыторыях падаецца цікавым. Аднак ім былі агучаны абавязковыя ўмовы: для прыходу «галандскіх сіл у аграрны сектар акупаваных савецкіх тэрыторый» парэбна было стварыць бездакорныя мясцовыя ўмовы; кіраўніцтву Нідэрландаў павінна было дакладна растлумачыць магчымасці размяшчэння і прадукцыйнага забеспячэння іх грамадзян, а таксама выразна акрэсліць сферы іх дзейнасці і магчымую кампенсацыю [6, л. 20, 22].

28 лютага 1942 г. у Гаазе адбылася нарада на чале з генеральным камісарам для асобных даручэнняў на захопленых нідэрландскіх тэрыторыях Фрыцам Шмідтам па праблеме ўдзелу галандцаў у сельскагаспадарчай вытворчасці на акупаваных савецкіх тэрыторыях. Абмяркоўвалася пытанне ўдзелу галандскіх арганізацый у «засваенні захопленых усходніх тэрыторый». Вырашылі, што ад супрацоўніцтва з гандлёва-сельскагаспадарчай

фірмай «Кулано», па 4-гадовым плане, адмаўляцца не будуць. Была таксама дасягнута дамоўленасць аб тым, што галандскія сяляне, якія будуць падрыхтаваны для працы на захопленых усходніх тэрыторыях, адразу змогуць размясціцца ў Галандыі ў лагеры горада Эммен, адкуль непасрэдна будуць адпраўлены на акупаваныя тэрыторыі [6, л. 48–49].

2 сакавіка 1942 г. адбылася другая нарада з удзелам Ф. Шмідта, у якой удзельнічалі таксама прадстаўнік міністэрства па захопленых усходніх тэрыторыях доктар Гостэ, сакратар галоўнага аддзела «харчавання і сельскай гаспадаркі» ў Гаазе Вензе і г.д. На ёй было падкрэслена, што задача галандцаў на захопленых савецкіх тэрыторыях – стаць «першакласнымі сельскагаспадарчымі кіраўнікамі». Разглядаліся нават пытанні будучага выкарыстання галандцаў-садаводаў [7, л. 65].

У гэты час у галандскай прэсе пачалася моцная прапагандысцкая кампанія. Вялася размова аб тым, што Нідэрланды – краіна занадта малая, каб пракарміць усіх сваіх жыхароў. У галандскай нацысцкай газеце «Nationale Dagblad» бургамістр горада Эммена, напрыклад, паведамляў, што «у рэгіёне пражывае каля 10 000 лішніх чалавек». Ён адзначаў, што ў паловы насельніцтва атрымаецца знайсці працу ў прамысловасці, аднак другой палове прыйдзецца шукаць сабе жыццёвую прастору на ўсходзе. «Асабіста ў мяне толькі адно жаданне: першае галандскае паселішча на “Украіне” павінна атрымаць назву “Новы Эммен”» [4].

26 мая 1942 г. адбыліся канчатковыя перамовы паміж рэйхскамісарам Нідэрландаў Артурам Зейсам Інквартам, міністрам Фішбёкам, доктарам Хольцам і старшынёй нідэрландскага банка Ростам ван Тонінгенам. У выніку гэтых перамоў было прызнана неабходным заснаваць галандскую кампанію, якой было вырашана даверыць «правядзенне нідэрландскага засваення ўсходніх тэрыторый праз фірмы ці праз людзей» [7, л. 65].

6 чэрвеня 1942 г. ў бюро Нотара Гронера ў Амстэрдаме была заснавана акцыянерная кампанія з рэзідэнцыяй ў Гаазе, якая мела пачатковы капітал ў памеры 2 500 000 галандскіх гульдэнаў і атрымала назву – Нідэрландская усходняя кампанія (НУК). Яе прэзідэнтам стаў Мейнауд Рост ван Тонінген, генеральны сакратар міністэрства фінансаў і старшыня Нідэрландскага банка [8, л. 58], намеснікам прэзідэнта стаў Ф. Рамбоннэт, а генеральным дырэктарам быў прызначаны Даніэль Кранц [9].

Філіялы НУК былі створаны ў Берліне, Каўнасе, Вільні, Рызе, Дэрпце, Роўна, Кіеве і Мінску. Мейнауд Рост ван Тонінген быў прызначаны таксама старшынёй Наглядальнай рады НУК. У дапаўненне да гэтага быў таксама створаны Галандскі ўсходні інстытут – спачатку ў якасці статыстычнага і навукова-даследчага аддзела, але пасля ён выкарыстоўваўся ў першую чаргу як прапагандысцкі і інфармацыйны орган НУК, які адказваў таксама за адукацыю будучых усходніх каланістаў. Яго дырэктарам стаў доктар Годхуз [10].

22 верасня 1942 г. была заключана дамова паміж земляробчым таварыствам «Остланд» (ЗТО) і Нідэрландскай усходняй кампаніяй, згодна з якой, апошняя павінна была падрыхтаваць галандскіх спецыялістаў ў

сельскагаспадарчай галіне для іх працы на тэрыторыі рэйхскамісарыята «Остланд». Па дамове галандскія спецыялісты павінны былі прайсці спецыяльнае сельскагаспадарчае навучанне. НУК павінна была прадстаўляць галандцам зарплату, велічыня якой был дакладна вызначана [11, л. 69]. У сваю чаргу земляробчае таварыства было абавязана ўзяць на службу галандцаў пасля іх навучання, а таксама кампенсаваць усходняй кампаніі ўсе затраты па дастаўцы неабходнага для навучання абсталявання. Усходняя кампанія павінна была таксама паклапаціцца і аб дастаўцы галандцаў да школьнага лагера, дзе апошнія павінны былі прымацца ЗТО, якое ў сваю чаргу павінна было вярнуць НУК грошы за падарожжа. У выпадку, калі земляробчае таварыства адмаўлялася ад прыёму галандцаў на службу, Нідэрландская ўсходняя кампанія абавязвалася паклапаціцца аб іх вяртанні на радзіму за свой кошт [11, л. 70–71].

У верасні 1942 г. была заключана другая дамова аб выкарыстанні дзяржаўных маёнткаў Вака Т і Ландвараў на паўднёва-заходніх тэрыторыях генеральнай акругі «Літва» для засялення і вучобы нідэрландскіх сялян. Апошнія павінны былі пасля спецыяльнай вучобы заняць пасады кіраўнікоў сельскагаспадарчых маёнткаў, сельскагаспадарчых апрацоўваючых і перапрацоўваючых прадпрыемстваў і асістэнтаў на сельскагаспадарчых прадпрыемствах у заходніх абласцях генеральных акруг «Літва» і «Беларусь». Вучоба галандцаў павінна была вясціся на працягу 2 месяцаў. Акрамя сельскагаспадарчых заняткаў былі ў школьнай праграме і курсы па краіназнаўстве [12, л. 143].

Згодна з цыркулярам земляробчага таварыства «Остланд» ад 13 лістапада 1942 г. звальненні галандцаў маглі праходзіць толькі праз цэнтральнае бюро таварыства ў Рызе. Галандцы як супрацоўнікі таварыства бясплатна атрымоўвалі прадуктовае забеспячэнне і памяшканне. З 1 лістапада 1942 г. усе галандцы былі застрахаваны ад няшчасных выпадкаў. Зямельнае таварыства «Остланд» прапаноўвала ў балтыйскіх дзяржавах і ў Беларусі ў галіне сельскай гаспадаркі выкарыстаць 600 галандскіх спецыялістаў: 200 – для дзяржаўных маёнткаў, звязаных з агародніцтвам; 100 – для садаводчых гаспадарак; 100 чалавек, якія змогуць весці сельскагаспадарчую статыстыку і бугхалтэрыю, 200 – у якасці кіраўнікоў сельскагаспадарчых прадпрыемстваў [6, л. 84].

У жніўні 1942 г. адбылося пасяджэнне гаспадарчай камісіі Нідэрландскай усходняй кампаніі, на якім абмяркоўваліся пытанні аб задачах яе дзейнасці на тэрыторыі рэйхскамісарыята «Остланд». У ім удзельнічалі прэзідэнт НУК Рост ван Тонінген і іншыя кіраўнікі кампаніі, а таксама прадстаўнікі аддзела харчавання і сельскай гаспадаркі рэйхскамісарыята. Былі абмеркаваны прапановы аб удзеле галандскіх спецыялістаў у кіраўніцтве сельскагаспадарчымі маёнткамі [12, л. 55–56].

У верасні 1942 г. у Вілейцы адбылося пасяджэнне кіраўнікоў земляробчага таварыства «Остланд». Па пытанні знаходжання галандскіх сельскагаспадарчых спецыялістаў на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь»

была зроблена выснова, што яно вельмі плённае, і нядрэнна было б у канцы месяца атрымаць яшчэ 120 спецыялістаў. Планавалася, што частка спецыялістаў павінна будзе стаць на чале маёнткаў, а іншыя будуць вучыцца ў кіраўнікоў маёнткаў. Неабходнасць падрыхтоўкі такіх спецыялістаў тлумачылася тым, што агульная колькасць маёнткаў у заходняй частцы Беларусі была вельмі высокай. Напрыклад, у акрузе Вілейкі было 147 маёнткаў з зямельнай плошчай каля 500 га [13, л. 166–167].

Каб павысіць прафесійны ўзровень галандскіх сялян, было вырашана арганізаваць шэраг дадатковых цэнтраў навучання, прафесійных агранамічных і сельскагаспадарчых школ і на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Валынь-Падолія». Адна з такіх школ была арганізавана ў г. Рагачове (Ровеньская акруга). Яе ўзначальваў галандзец Арнаут де Ваард, звычайны фермер, які быў членам Нідэрландскай нацыянал-сацыялістычнай партыі і меў сельскагаспадарчую адукацыю. Гэтая школа пачала функцыянаваць у лістападзе 1942 г. У ёй працаваў штат выкладчыкаў, які складаўся з галандцаў і немцаў. Згодна з нацысцкімі дакументамі ўмовы працы для іх былі даволі цяжкія, існавала небяспека партызанскіх нападаў, у сувязі з гэтым, для самаабароны, у школу была дастаўлена ў лютым 1943 г. зброя. Школе не хапала патрэбнага абсталявання. Тым не менш у перыяд з лістапада 1942 г. па сакавік 1943 г. у гэтай школе прайшлі навучанне каля 100 галандцаў, якія былі падрыхтаваны да працы ў сельскай гаспадарцы і ў далейшым былі пастаўлены кіраўнікамі дзяржаўных сельскагаспадарчых маёнткаў [14].

У перыяд з чэрвеня па лістапад 1942 г. у рамках супрацоўніцтва з земляробчым таварыствам на тэрыторыю рэйхскамісарыята «Остланд» быў прызваны 61 галандскі сельскагаспадарчы спецыяліст. Пры гэтым прэтэндэнты павінны былі здаць агульны экзамен у аграрнай галіне, па выніках якога вызначаліся лепшыя кандыдаты [15, л. 19].

У лістападзе 1942 г. у генеральным камісарыяце «Валынь-Падолія» была адчынена яшчэ адна агранамічная школа для галандскіх сялян ў Баранаўцы. Праз некаторы час, у снежні 1942 г., на пасяджэнні ў г. Роўна кіраўнік аддзела харчавання і сельскай гаспадаркі рэйхскамісарыята «Украіна» Кёрнер адзначыў, што ён задаволены яе дзейнасцю. Ён падкрэсліў, што галандскія сяляне павінны будуць пасля кароткага практычнага навучання стаць самастойнымі кіраўнікамі баз і дзяржаўных маёнткаў з зямельнай плошчай каля 10 000 га. Самыя лепшыя будуць напраўлены кіраўнікамі прадпрыемстваў, астатнія павінны будуць стаць іх асістэнтамі. Кёрнер выразіў надзею, што НУК на працягу 1943 г. падрыхтуе вялікую колькасць сельскагаспадарчых кіраўнікоў. Паміж Усходняй кампаніяй і Кёрнерам была заключана дамоўленасць, што да распараджэння НУК павінны будуць давацца дзяржаўныя маёнткі ад 1 000 да 1 500 га на той жа падставе, што і ў «Остландзе», якія трэба будзе зрабіць узорнымі. Гэтыя маёнткі павінны былі быць забяспечаны праз кампанію першакласнай галандскай жывёлай (коні, каровы, авечкі), а таксама сельскагаспадарчай тэхнікай.

Таксама на гэтым пасяджэнні пры разглядзе тэхнічных падстаў былі абмеркаваны праекты размеркавання на тэрыторыі рэйхскамісарыята «Украіна» сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Былі разгледжаны прапановы аб стварэнні пры дапамозе галандскіх спецыялістаў малочных прадпрыемстваў, фабрык па вытворчасці сыра, макароннай прамысловасці, прадпрыемстваў па перапрацоўцы садавіны і гародніны і г.д. [16, л. 11–12, 26–26 а].

Па звестках на ліпень 1944 г. на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь» знаходзілася каля 46 сельскагаспадарчых кіраўнікоў-галандцаў, з іх у Мінску працавала 11 чалавек, у Пінску – 1, у Вілейцы – 15, у Слуцку – 4, у Глыбокім – 7, у Баранавічах – 2, у Ганцавічах – 2, у Лідзе – 3, у Слоніме – 1 [8, л. 112].

8 лютага 1943 г. была заключана працоўная дамова паміж Цэнтральным гандлёвым таварыствам «Ост» і НУК. Адзначалася, што ЦГТ будзе плаціць узятым на службу галандцам ў рэйхскамісарыяце «Украіна» і на тэрыторыі генеральнага камісарыята «Беларусь» штомесячна каля 200 RM, а на тэрыторыі генеральнай акругі «Літва» яшчэ будзе даплачваць кампенсацыю за «цяжкую працу» [15, л. 72]. Былі выказаны наступныя першачарговыя патрабаванні Цэнтральнага гандлёвага таварыства «Ост» па размеркаванні галандскіх сельскагаспадарчых спецыялістаў на захопленых усходніх тэрыторыях: 30 спецыялістаў у якасці кіраўнікоў малочных заводаў у рэйхскамісарыятах «Остланд» і «Украіна» і адзін спецыяліст у якасці кіраўніка сельскагаспадарчага прадпрыемства па вытворчасці сыра ў рэйхскамісарыяце «Украіна» [6, л. 86].

З 8 чэрвеня 1943 г. пачаў дзейнічаць новы вучэбны цэнтр для будучых галандскіх каланістаў-перасяленцаў у Нідэрландах, г. Хоофдорп [5], які быў арганізаваны Роксамам, лідарам Галандскага сялянскага саюза [9]. Час навучання ў ім доўжыўся тры тыдні, падчас якіх галандцы вучылі нямецкую і рускую мовы, ім таксама даваліся кансультацыі аб тым, што чакае іх на акупаваных усходніх тэрыторыях. Акрамя таго, іх папярэджвалі аб партызанскай небяспецы і вучылі карыстацца зброяй [5].

22 і 23 лістапада 1943 г. адбыліся перамовы паміж генеральным камісарам Беларусі группенфюрэрам СС К. фон Готбергам і гаўляйтарам, намеснікам усходняга міністра А. Мейерам. Апошні праінфармаваў фон Готберга аб стане перамоў па пытанні выкарыстання галандцаў на працах у Лідзе і ўвогуле ў заходніх раёнах камісарыята. К. Готберг вітаў такое рашэнне і адзначыў, што яму тэрмінова патрэбна 2–3 тыс. працоўнай галандскай сельскагаспадарчай сілы, якою ён адразу ж заменіць палякаў, працуючых кіраўнікамі прадпрыемстваў, аграномамі, бухалтарамі і іншымі спецыялістамі [17, л. 152]. У гэты час таксама вяліся перамовы аб неабходнасці ўзбраення галандскіх спецыялістаў для іх самаабароны ў сувязі з пастаяннымі партызанскімі вылазкамі, аднак гэтае пытанне так і не было вырашана станоўча [10].

Вясной 1944 г. дзейнасць Нідэрландскай усходняй кампаніі ідзе на спад па прычыне ўзмоцненай партызанскай дзейнасці на акупаванай савецкай тэрыторыі і набліжэння фронту. У мэтах захавання свайго жыцця галандскія

сельскагаспадарчыя спецыялісты пачынаюць масава ад'язджаць [11, л. 147]. Аднак яны вярталіся не ў Нідэрланды, а накіроўваліся ў нацысцкую Германію, дзе працягвалі працаваць на сельскагаспадарчых фермах. Таксама некаторыя з іх былі адпраўлены на службу ў вермахт [18].

Лідар НУК Рост ван Тонінген 28 снежня 1944 г. быў адхілены кіраўніком галандскага ўрада Мусертам ад кіраўніцтва кампаніяй. Пасля вызвалення Нідэрландаў ад нацысцкай акупацыі НУК была ліквідавана, а яе члены асуджаны [10]. Нельга забываць, што НУК была нацысцкай арганізацыяй, якая магла існаваць толькі пад нямецкім патранатам. Але жыццё на акупаваных савецкіх тэрыторыях моцна адрознівалася ад чаканняў галандскіх каланістаў. Шмат хто з іх падчас працы быў ізаляваны ад кантактаў з роднымі і сябрамі. На іх знаходжанне на заходнебеларускай тэрыторыі моцны уплыў аказаў і партызанскі рух: партызаны не адрознівалі немцаў і галандцаў, для іх яны былі акупантамі, якія прыйшлі рабаваць іх родную краіну. Таму галандскім сялянам таксама прыходзілася ўзбройвацца і, замест таго, каб займацца сельскай гаспадаркай, ратаваць сябе.

Такім чынам, на прыкладзе разгледжаных вышэй фактаў мы можам прасачыць, як паступова, пры кіраўніцтве германскіх і замежных манаполій адбываўся захоп сельскагаспадарчай вытворчасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Гэты працэс, па задумцы нацыстаў, павінен быў падрыхтаваць захопленыя тэрыторыі да пасляваеннай каланізацыі і германізацыі. Важную ролю тут адыграў таксама правал маланкавай вайны і, як вынік, неабходнасць інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці на акупаванай заходнебеларускай тэрыторыі ў мэтах максімальнага атрымання аграрнай прадукцыі для нацысцкай Германіі. Згодна з дырэктывамі «Карычневай папкі», у гэты час ажыццяўлялася падрыхтоўка часткі іншаземцаў ў якасці прафесійных сельскагаспадарчых працоўных кадраў па прычыне недахопу нямецкіх аграрных спецыялістаў. Пры гэтым неабходна адзначыць, што галандскіх фермераў рыхтавалі ў асноўным на галоўныя пасады: кіраваць дзяржаўнымі маёнткамі, сельскагаспадарчымі перапрацоўваючымі прадпрыемствамі, альбо быць асістэнтамі кіраўнікоў на акупаванай тэрыторыі Заходняй Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Факторович, А. А.* Крах аграрной политики немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии / А. А. Факторович. – Минск : Наука и техника, 1979. – 150 с.
2. *Мюллер, Н.* Вермахт и оккупация (1941–1944) / Н. Мюллер. – М. : Воениздат, 1974. – 387 с.
3. Федэральны архіў Германіі (скарочана – ВА). – R6. – Спр. 443.
4. Fiasko-Gitlera-v-Ukraine-2239. Html "Foreign Affairs", студзень 1943, Joahim Jesten [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www. rusprauda.info/. – Дата доступу : 19.11.2015.
5. Margot Elisabeth van Elk. Sleutel tot de toekomst? Het kolonisatieavontuur van twee Nederlandse boeren tijdens de Tweede Wereldoorlog. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://www.dspace.library.uu.nl. – Дата доступу : 15.02.2016.

6. BA, R6. – Спр. 440.
7. BA, R6. – Спр. 447.
8. BA, R6. – Спр. 451.
9. *Krusemeijer, J.* Kameraadskes en kolonisten / J. Krusemeijer [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступу : http://dspace.library.uu.nl. – Дата доступу : 15.03.2016.
10. Архіўныя звесткі Нідэрландскага інстытута вывучэння вайны, Халакоста і генацыду (NIOD) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.archieven.nl. Nederlandse Oost Compagnie. – Дата доступу : 10.03.2016.
11. BA, R6. – Спр. 446.
12. BA, R6. – Спр. 442.
13. BA, R6. – Спр. 441.
14. *Flietstra V.* Arnout de Waard: Bezetter of Boer? De belevingen van een boerendirecteur in Rogatschef / V. Flietstra [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.dspace.library.uu.nl. – Дата доступу : 12.02.2016.
15. BA, R6. – Спр. 445.
16. BA, R6. – Спр. 448.
17. НАРБ. – Фонд 1440. – Воп. 3. – Спр. 932.
18. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : www.resources.huygens.knaw.nl. – Дата доступу : 19.11.2015.